**А смерць** крочыла побач // Герой працы (Шуміліна). — 1990. — 9 мая — С. 3.

# А СМЕРЦЬ КРОЧЫЛА ПОБАЧ



Іх фотаздымкі ў раённым музеі Народнай Славы размешчаны амаль побач. Хаця сябрамі ці аднавяскоўцамі яны не былі, разам не вучыліся і не працавалі: Андрэй Лапцеў (на здымку злева) закончыў Шумілінскую сярэднюю школу № 1, а Ігар Ляўша – Обальскую сярэднюю школу.



Абодва ж прайшлі праз Афганістан. Нягледзячы на свой крыху больш як 20-гадовы ўзрост, маюць дзяржаўныя ўзнагароды. Ігар Ляўша ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа». Такі ж медаль і ў Андрэя Лапцева, а таксама юбілейны медаль «70 год Узброеных Сіл СССР». Нягледзячы на малады ўзрост, ім давялося перажыць нямала горкіх часін побач са смерцю.

...Сядзець ён не мог. На жывот класціся нельга: там рана. Прыпадняўшы, яго трымалі. «Ну, а цяпер цярпі, хлопец!» – пачуў ён чыйсьці голас. І адчуў, як востры скальпель увайшоў у спіну...

Ен дыхаў глыбока, і з кожным удыхам станавілася лягчэй: лёгкія вызваляліся ад згусткаў крыві.

«Піць. Дайце хоць глыток вады», – пачулі шэпат параненага Ігара Ляўшы. Доктар, які працягнуў яму шклянку вады, здаваўся для Ігара самым дарагім чалавекам...

У той ледзьве не пагібельны для Ігара чэрвеньскі дзень на баявое заданне ён і яго зямляк Сяргей Жданаў прасіліся разам. Сяргея пакінулі ў часці.

...Заданне выканалі і сабраліся ўжо вяртацца, як ударылі душманы. Разгарэўся бой... Літаральна ў лічаных метрах разарвалася 120-міліметровая міна. Ігар адчуў рэзкі боль у руцэ і жываце.

А побач закрычаў сябар Анатоль. Ен клікаў на дапамогу. Ігар ледзьве змог павярнуць твар у той бок, адкуль чуў голас Анатоля, і жахнуўся: жывот сябра быў рас- пораты асколкам... Перад вачыма ўсё паплыло...

Апрытомнеў Ігар ад крыку: «Трымайся!» Свае салдаты перавязвалі яго. Анатоль жа быў ужо мёртвы...

Калі вярнуліся да сваіх, Ігар яшчэ ўсё не мог уцяміць, што з ім. Убачыў, як да яго падбег Сяргей і раптам, заплакаўшы, закрычаў: «Не памірай, Ігар!» Зразумеў: штосьці цяжкае. Доўга цягнуліся дні ў шпіталі...

Дваццаць адзін месяц правёў у Афганістане Андрэй Лапцеў.

– Больш за ўсё мне запомніўся дзень, калі давялося ісці ў першы рэйд, – успамінае сёння Андрэй. – Душманы абстралялі тады нашы машыны. А калі ўбачыў забітага сябра свайго, сэрца замерла. А затым... За два гады наглядзеўся на смерць, што крочыла побач, вырывала сяброў...

Сёння Ігар Ляўша – студэнт аднаго з ленінградскіх інстытутаў. Андрэй жа Лапцеў працуе ў раённым вузле сувязі.